**Гарбачоў, М.** За штурвалам «вяртушкі» / М. Гарбачоў // Лепельскі край. – 2017. – 18 жн. – С. 3.

## ЗА ШТУРВАЛАМ «ВЯРТУШКІ»

Многія нашы землякі вывучыліся на авіяцыйных лётчыкаў, верталётчыкаў і іншых ваенных спецыялістаў, якія дзесяцігоддзямі былі на абароне паветраных прастораў Айчыны і цяпер праходзяць сапраўдную вайсковую службу або знаходзяцца ў запасе. У выпадку неабходнасці заўсёды яны гатовы стаць у баявы строй, даць дастойны адпор любому агрэсару. Адзін з іх – Пётр Быкаў з аграгарадка Стаі, які яшчэ ў юнацтве зрабіў свядомы выбар прафесіі афіцэра ваенна-паветраных сіл. Пасля заканчэння Стайскай васьмігодкі і СШ №3 горада Лепеля ў 1975 годзе ён быў прыняты на вучобу ў Віцебскі аэраклуб ДТСААФ. Паспяховае авалоданне ведамі і практычнымі навыкамі кіравання магутнай паветранай машынай (верталётам) дазволіла Пятру Аляксандравічу паступіць у Багадохаўскі вучэбна-авіяцыйны цэнтр, удасканаліць тут сваё прафесійнае майстэрства кіравання вінтакрылай «ластаўкай» з прысваеннем высокага афіцэрскага звання. У 1978 годзе Пётр Быкаў быў накіраваны для далейшага праходжання службы ў Беларускую ваенную акругу ў вайсковую часць №01009, якая была раскватаравана ў Заслонаве.

– Аэрадром знаходзіўся за чатыры кіламетры ад Заслонава ў накірунку Горак, дзесьці паміж Горкамі і Зорніцай, – успамінае Пётр Аляксацдравіч. – На ім базіравалася тры звяны верталётаў МІ–8 і адно звяно самалётаў АН–2. У кожным звяне налічвалася па чатыры баявыя машыны.

– Калі трапілі на вайну ў Афганістан?

– У ліпені 1987 года, калі быў дастаўлены на аэрадром у Кабуле. Ваяваў у складзе 50-га авіяцыйнага палка камандзірам верталёта МІ–8. У склад экіпажа ўваходзілі таксама лётчык-штурман і бартавы механік. На ўзбраенні быў буйнакаліберны кулямёт і ракеты з толавай начынкай, кожная дыяметрам восем сантыметраў з дальнасцю стральбы да паўтара кіламетра. На верталёце было прымацавана чатыры блокі такіх ракет па 16 у кожным блоку. Можна было рабіць адначасовы залп з двух, чатырох, васьмі і нават шаснаццаці ракет.

Наша вінтакрылая машына падтрымлівала наземныя баявыя дзеянні войскаў, знішчала месцы назапашвання салдат ворага, падаўляла агнявыя кропкі і ўзрывала з паветра склады ўзбраенняў, прадуктаў харчавання.

У выпадку неабходнасці перавозілі дэсакту глыбокі тыл душманаў. Тэхнічныя магчымасці нашага верталёта МІ–8 дазвалялі размясціць і даставіць па паветры ў пункты прызначэння 12 ваеннаслужачых 103-й Віцебскай паветрана-дэсантнай дывізіі. Часта з дапамогай верталётаў рабілася і ратацыя нашых салдат на трыццаці стацыянарных ваенных пастах, якія былі сфарміраваны па ўсім перыметры наўкол Кабула. На іх верталётамі дастаўляліся таксама боепрыпасы і прадукты харчавання.

– Колькі «вяртушак» звычайна вылягала на баявое заданне?

– Два верталёты. Адзін у выглядзе вядучай машыны, а другі прыкрываў яе з тылу. Ва ўмовах вайны была магчымасць дзейнічаць толькі малой колькасцю верталётаў, хутка і абачліва, пры стральбе на зусім невялікі час «завісаць» у адным месцы ў паветры, паколькі ў

ворага на ўзбраенні былі амерыканскія супрацьпаветраныя ракеты «Стынгер» і іншыя эфектыўныя сродкі агнявога паражэння.

– Які вылет асабліва запомніўся?

– 21 снежня 1987 года ў дзевяць гадзін 20 хвілін пры выкананні баявога задання ў наваколлі горада Гардэза ў правы рухавік нашага верталёта трапіла ракета «Стынгер». Узнік пажар, была пашкоджана сістэма кіравання. Верталёт стаў завальвацца на бок, пачаў губляць вышыню. Нам нічога не заставалася рабіць, яктолькі скакаць з парашутамі. На жаль, бартавы механік Віктар Галаўко з горада Бяроза Брэсцкай вобласці трапіў пад вінт і загінуў. Мне разам з лётчыкам-штурманам Віктарам Кузьмянковым з Гомеля на парашутах удалося прызямліцца, хаця душманы і вялі па нас прыцэльны агонь са стралковай зброі. Віктар Кузьмянкоў у выніку атрымаў кулявое раненне, але застаўся жывы. Нам вельмі пашчасціла, што непадапёк агнявую падтрымку нашых наземных вайсковых часцем ажыццяўлялі яшчэ некалькі вінтакрылых машын, якія бачылі гібель нашага верталёта і заўважылі месца, дзе мы прызямліліся на парашутах. Яны тэрмінова накіраваліся ў наш бок, з рызыкай для сябе спусціліся на зямлю і паднялі нас на борт, не дазволілі ворагу ўзяць у палон.

– Колькі ўсяго баявых вылетаў зрабілі?

– 116.

– Калі пакінулі Афганістан?

– У канцы чэрвеня 1988 года, калі споўніўся адзін год маёй службе ва ўмовах рэальных баявых дзеянняў. Лётны склад ваеннаслужачых накіроўваўся камандаваннем у гэтую краіну тэрмінам толькі на адзін год, а прадстаўнікі наземных службаў – на два гады.

– Ці маеце баявыя ўзнагароды?

– За праяўленыя мужнасць і гераізм, асабісты ўклад у разгром душманаў пад горадам Хост быў прадстаўлены да ўзнагароджання ордэнам Чырвонага Сцяга. Копія гэтага прадстаўлення захоўваецца ў маёй асабістай справе ў абласным ваенкамаце. На жаль, гэтую ўзнагароду не атрымаў. Можа гэта звязана з тым, шга ў хуткім часе разваліўся СССР і было не да ўзнагарод вышэйшаму ваеннаму кіраўніцтву.

– Дзе далей праходзілі вайсковую службу?

– У Чэхаславакіі, Прывожска-Уральскай ваеннай акрузе. У 1992 годзе ў званні капітана быў звольнены ў запас.

– Як абстаяць справы ў асабістым жыцці?

– З жонкай Валянцінай выхавалі дваіх дзяцей – сына Аляксандра і дачку Людмілу. Яны ўжо дарослыя і маюць свае сем’і. Ужо нават паспелі падарыць нам траіх унучак і аднаго ўнука.

Жыву з жонкай у Стаях у кватэры з усімі зручнасцямі.

*Мікалай* ***ГАРБАЧОЎ***